■ Медыяпрастора

Галоўны рэдактар «Гомельскай праўды» Сяргей БЯСПАЛЫ:

«КРЫТЫКАВАЦЬ ТРЭБА, КАЛІ ЁСЦЬ ЗА ШТО»

«Гомельская праўда», адна з самых паспяховых і папулярных рэгіянальных газет краіны, сёння адзначае 95-гадовы юбілей

Галоўны рэдактар «ГП» Сяргей Бяспалы больш як чвэрць стагоддзя працуе ў газеце: прыехаўшы па размеркаванні пасля заканчэння журфака БДУ, прайшоў усе рэдакцыйныя прыступкі: ад карэспандэнта да галоўнага рэдактара.

Фота Алега БЕЛАВУСАВА.

Сяргей Бяспалы знаёміць старшыню Гомельскага аблвыканкама Уладзіміра Дворніка з экспанатамі музея «Гомельскай праўды».

— Гістарычнае расследаванне біяграфіі газеты — «жанр» унікальны, але не будзе перабольшаннем сказаць, што справіліся вы з ім бліскуча?

— У апошні час журналісты «Гомельскай праўды» актыўна займаліся гісторыяй газеты. Вялі перапіску з архівамі і бібліятэкамі Масквы, Санкт-Пецярбурга, кантактавалі з супрацоўнікамі абласнога архіва. Знайшлі шмат цікавых дакументаў, даведаліся прозвішчы практычна ўсіх рэдактараў — іх было не 30, як думалі раней, а ў два разы больш. Тады ж высветлілася, што сапраўдны дзень нараджэння нашай газеты — не 12 лістапада, а 22 сакавіка 1917 года. Менавіта ў гэты дзень (па новым стылі) выйшаў першы нумар «Известий Гомельского Совета рабочих и солдатских депутатов», пераемніцай якіх праз гады і стала «Гомельская праўда».

Гісторыя «Гомельскай праўды» надзвычай цікавая. Тут пачынаў працоўную біяграфію Паўлюк Трус, дэбютаваў малады Іван Шамякін, друкаваўся Ілья Эрэнбург... У перадваенны год газету рэдагаваў будучы камандзір партызанскага злучэння Герой Савецкага Саюза Ілья Кожар.

— Нядаўна ў абласным цэнтры з'явіўся бульвар «Гомельскай праўды» — сведчанне аўтарытэтнасці выдання і павагі гараджан да сваёй газеты...

— А днямі, акурат да юбілейнай даты, адкрыецца і музей газеты. Ёсць ужо цікавыя экспанаты: пішучая машынка (нямецкая) пачатку XX стагоддзя, старадаўні амерыканскі фотаапарат (у працоўным стане!)... Нават лінатып хочам зацягнуць у музей!

— Сяргей Міхайлавіч, калі б вам прапанавалі сфармуляваць уласную формулу поспеху...

— Мы імкнёмся бачыць тое, што звычайна ніхто не заўважае, а ў агульнавядомым знаходзіць непрыкметнае для ўсіх і цікава распавядаць аб гэтым чытачу. Наша правіла: не гнацца за таннай сенсацыяй, не страляць з гарматы па вераб'ях, пазбягаць паспешлівых высноў — каб не дапусціць недакладнай інфармацыі.

Традыцыйна шмат увагі ўдзяляем праблемным, крытычным публікацыям, і не толькі на рэгіянальныя тэмы.

— Праблемнасць, крытычнасць... Цікава, а як улады вобласці рэагуюць на гэтыя журналісцкія арыенціры? Напэўна, не ўсе журналісцкія расследаванні або крытычныя выступы «Гомельскай праўды» ўспрымаюцца «на ўра»?

— Мы партнёры з абласной вертыкаллю ўлады. А добры партнёр можа смела сказаць пра недахопы, адзначыць праблемы, крытычна паглядзець на сітуацыю. І былы губернатар, а цяпер старшыня Камітэта дзяржкантролю Аляксандр Серафімавіч Якабсон, і цяперашні губернатар Уладзімір Андрэевіч Дворнік — уважлівыя чытачы «Гомельскай праўды». Вельмі пільны наш чытач і мэр Гомеля Віктар Іванавіч Піліпец. Асобныя ідэі публікацый ён сам распісвае службам горада для выканання.

Не сакрэт: калі ў газеце з'яўляецца крытычны матэрыял, звычайна пачынаюцца званкі. «Высвятленне адносін» —— яно ў нас пастаяннае. Але куды страшней, калі рэдакцыйныя тэлефоны маўчаць, газетныя публікацыі нідзе не абмяркоўваюцца. Тады трэба задумацца, ці тое робім.

Так, мы не баімся пакрытыкаваць, калі ёсць за што. Трэба іншага баяцца: каб газета не ператварылася ў адзін вялікі прэс-рэліз. Гэта ўжо не газета.

— «Гомельскую праўду» нярэдка крытыкуюць за няўвагу да роднай мовы, якая часам прысутнічае толькі ў назве газеты...

— Ваша пытанне цалкам правамернае, нас гэта таксама турбуе. Больш за тое, мы просім, каб журналісты рыхтавалі матэрыялы на роднай мове. У нас нават рубрыкі ёсць, пад якімі друкуюцца артыкулы толькі па-беларуску. Але ж гэта, на жаль, кропля ў моры. З другога боку, у нас дзве дзяржаўныя мовы. Яшчэ некалькі гадоў таму мы вызначыліся: на якой мове напіша журналіст або прыйдзе ў рэдакцыю ліст, на той і друкуем тэкст.

— Мяркуючы па публікацыях, у газеце склаўся выдатны творчы калектыў.

— Сучасныя веды і крэатыў маладых, моцны прафесіяналізм і жыццёвая мудрасць вопытных журналістаў арганічна спалучаюцца. Мы ўсе — аднадумцы і патрыёты сваёй газеты. У нас ёсць «Клятва журналіста «Гомельскай праўды» (клятву Гіпакрата даюць усе медыкі). Ужо некалькі маладых калег каля рэдакцыйнага сцяга перад усім калектывам урачыста пакляліся быць вернымі сваёй прафесіі, памнажаць добрую славу газеты, пачулі шчырыя пажаданні ад старэйшых таварышаў.

Дарэчы, з цёплымі і шчырымі пажаданнямі ў панядзелак завіталі ў рэдакцыю старшыня аблвыканкама Уладзімір Андрэевіч Дворнік і старшыня абласнога Савета дэпутатаў Марыя Андрэеўна Бондар. Яны не толькі павіншавалі наш калектыў з 95-годдзем газеты — размова ішла і пра вастрыню пяра, асвятленне ў друку надзённых праблем, пра задачы, якія газета павінна дапамагаць вырашаць органам улады.

Пасля гэтай сустрэчы кіраўнік вобласці правёў у прэс-цэнтры рэдакцыі прамую лінію з чытачамі газеты. Дарэчы, такія стасункі старшыні аблвыканкама з чытачамі «Гомельскай праўды» праходзяць у рэдакцыі пастаянна.

Таццяна ПАДАЛЯК

■ Казкі для дарослых

ЯНА І Я

Я адчуваю яе прыход спінным мозгам. Заўсёды адчувала... За некалькі секундаў да таго, як у замку пачынаў паварочвацца ключ, я ўжо ведала: яна стаіць на парозе. Чаму так адбывалася? Напэўна, я баялася яе — на ўзроўні падсвядомасці, на ўзроўні інстынктаў. У патрэбны момант уключаўся інстынкт самазахавання і дасылаў сігнал: «Увага, яна на падыходзе!» Я групавалася, як байцоўскі сабака, канцэнтравалася і прымала абаронную позу. У гэты момант адчыняліся дзверы, і на парозе з'яўлялася мая свякроў. Ні разу за ўвесь перыяд майго сямейнага жыцця інтуіцыя мяне не падманула.

Так было і цяпер. З той толькі розніцай, што я не адчула прывычнага «прыліву» боязі, а яна не стала адчыняць дзверы сваім ключом, а тактоўна пазваніла. Першы раз за ўсё жыццё... Нас абедзвюх чакала нялёгкая размова, і, напэўна, такім чынам яна хацела загадзя змякчыць сітуацыю.

Яна зайшла і ўбачыла спакаваныя сумкі — іх было тры. Я чакала заканамернага пытання і настроілася адказаць з выклікам — але яна ні пра што не спытала... З пакоя выбеглі дзве мае радасці, трох і пяці гадоў, і павіслі на бабулі. Яе погляд адразу пацяплеў, рысы твару памякчэлі. Яна дастала з-за спіны вялікі яркі пакет, адкрыла яго і, як цыркавы фокуснік, пачала выцягваць адтуль адну за адной усялякія цікавыя рэчы: ружовую куртачку, набор фламастараў-хамелеонаў, мазаіку, красоўкі на ліпучках, музычную шкатулку з цукеркамі, калейдаскоп...

— Ой, бабуля, ну ты зусім як Дзед Мароз! — піскнула Даша, спрабуючы нацягнуць на сябе куртку і красоўкі адначасова.

— Не Малоз, а Снягулка! — паправіла яе кемлівая Арыша, запіхваючы за шчаку шакаладку.

— Я магу прайсці? — спытала свякроў. Пад гэтым, напэўна, мелася на ўвазе наступнае: я заплаціла дастатковую цану за ўваход?

У пакоях пасля двухдзённых збораў панаваў гармідар, таму я запрасіла яе на кухню.

— Вячэраць будзеце?

Гэта было вельмі небяспечна з майго боку — задаваць ёй такое пытанне. Ніякай вячэры ў мяне не было і, шчыра кажучы, гатаваць яе я не збіралася. Мне не хацелася не тое што есці — жыць... Дзяўчаткі ж сядзелі на тварожна-сырковым «пайку» і кашах з пакетаў, што, па-мойму, іх цалкам задавальняла.

— Ты сапраўды вырашыла пераехаць? — пацікавілася яна, праігнараваўшы маё пытанне наконт вячэры.

Я рашуча матнула галавой: зразумела, вырашыла, няўжо нехта яшчэ сумняваецца?

Напэўна, ёй няпроста было захоўваць спакой.

— Такое выйсце падаецца мне не самым лепшым... Не вельмі разумна, пагадзіся, бадзяцца па чужых кутах і плаціць за гэта грошы, калі ў цябе ёсць свая кватэра.

— Свая кватэра? — мне здалося, яшчэ імгненне — і я сарвуся і перайду на крык. А магчыма, я ўжо крычала — як рыбіна, якую выпадковай хваляй выкінула на бераг, і яна засталася ляжаць на халодных каменнях. — Вы цудоўна ведаеце, якіх намаганняў каштуе мне кожны дзень знаходжання тут.

Яна паднялася з-за стала, узяла чайнік, наліла ў яго вады і паставіла на пліту. Я не бачыла яе твару, але была ўпэўнена, што на ім не адбілася ніякіх эмоцый. Як не адбівалася амаль ніколі, за выключэннем тых рэдкіх момантаў, калі яна заставалася сам-насам з унучкамі. Часам мяне наведвалі крамольныя думкі: ці патрэбна ёй увогуле што-небудзь, акрамя роўных калонак лічбаў на экране свайго камп'ютара? Ці ўмее яна памыляцца, плакаць, гаварыць неўпапад? Ці здагадваецца, што палова яе падначаленых лічаць месяцы, тыдні і дні да таго шчаслівага моманту, калі нарэшце можна будзе адправіць яе на заслужаны (яшчэ які заслужаны!) адпачынак? А другая палова даўно страціла надзею на тое, што гэта калі-небудзь здарыцца...

Яна была бездакорная ва ўсім. Прынамсі, да таго часу, пакуль не атрымала... аплявуху (фігуральную, але ўсё ж). І ад каго? Ад уласнага сына. Хто б мог падумаць!.. Яна пралічыла ўсё, расклала жыццё па палічках, а вось гэтага прадбачыць не здолела... Кінутыя сынам нявестка і двое малых дзяцей — гэта не ўпісвалася ў яе «сцэнарый», адладжаная схема разбуралася на вачах. Захоўваць пры такой сітуацыі «добрую міну» не ўяўлялася магчымым. Яна гэта разумела, таму і прыйшла.

— Ты сапраўды думаеш, што ў іншым доме, у іншай кватэры табе ўдасца вызваліцца ад сваіх думак і пачуццяў? — спытала яна роўным, спакойным тонам. Пытанне ўжо змяшчала ў сабе адказ, таму не было сэнсу пярэчыць. Але я запярэчыла, сказаўшы:

— Сапраўды.

Няўжо яна ўсё яшчэ спадзяецца, што я жартую? Або — што было б ідэальным варыянтам — жартуе яе сын? І што на мінулым тыдні ён жартам папрасіў мяне спусціцца сярод белага дня ў дворык нашага офіса, каб паведаміць, што сыходзіць з дому, бо пакахаў іншую... І яму вельмі шкада.

Якімі ўсё ж мы бываем наіўнымі, калі думаем, што можам кантраляваць сваё жыццё... Плануем на лета рамонт і перастаўляем у думках мэблю. Удасканальваем, так бы мовіць, «радавое гняздо», шукаем канапу «ў тон» шпалерам... А гадзіннік ужо адлічвае апошнія хвіліны. І тая, «іншая» жанчына (што ў ёй такога «іншага», скажыце мне?), схіліўшы набок галаву і прыжмурыўшы вочы, ужо праводзіць тваю законную «палову» ацэньваючым позіркам...

...На пліце пачаў пасвіставаць чайнік. Сумеснае чаяванне — гэта, дарэчы, рытуал, які мае на ўвазе задушэўную гутарку ці нешта накшталт яе. Але да нашай сітуацыі гэта не мела ніякага дачынення. Мы селі піць чай, каб запоўніць паўзу, якая зацягнулася. Я здагадвалася, што яе візіт быў хутчэй данінай ветлівасці. Такім «рэверансам», каб я не падумала, крый Божа, што яна на яго баку, на баку свайго сына. Зразумела ж, яна яго асуджае і пры першай магчымасці выкажа ўсё, што думае. Безумоўна, ён яшчэ вернецца. І ўсё пойдзе, як раней. Трэба толькі набрацца цярпення і пачакаць... Ён жа добры хлопчык, такія на дарозе не валяюцца...

— Ведаеш... — пачала яна, і я падрыхтавалася выпусціць першую партыю «шыпоў». — Толькі зразумей мяне правільна, калі ласка. Я ўдвая старэйшая за цябе, і зыходзячы выключна з гэтага, збіраюся даць табе параду... Не трэба ганяцца за ўчарашнім днём і шкадаваць аб тым, што ўжо мінула. Ты вартая лепшага — лепшага лёсу і лепшага спадарожніка. Цяпер табе здаецца, што неба абрынулася на зямлю і ўвесь свет настроены супраць цябе. Але і гэта міне, бо жыццё мацнейшае за ўсе нашы няшчасці і трагедыі... Я, на жаль, сама вельмі позна гэта зразумела. І не скарысталася шанцам. А ўсё магло б быць інакш...

І гэта гаварыла яна?! Жанчына з прамой спінай і ўзнятым падбародкам? Задаволеная мужам, дзецьмі, працай, кар'ерай і ўвогуле — жыццём? Я не верыла сваім вушам.

— Пачакайце, што вы маеце на ўвазе?

— Не што, а каго. Твайго свёкра і майго мужа...

— Але вы заўсёды і ўсім казалі, што ў вас ідэальны шлюб!..

— Я і цяпер магу так сказаць. Ідэальным шлюб бывае ў двух выпадках. Першы — калі жаданні яе і яго ў дачыненні адзін да аднаго супадаюць. Другі — калі гэтых жаданняў увогуле няма.

— Вы хочаце сказаць...

— Так. У нас быў менавіта другі варыянт... Не з самага пачатку, зразумела... Калі мы пазнаёміліся і пачалі сустракацца, ён закахаўся проста па-вар'яцку. У студэнцкай сталовай мог падоўгу сядзець насупраць, не дакранаючыся да ежы і не зводзячы з мяне вачэй. Уяўляеш? Кругом мітусня, штурханіна, усе бегаюць са сваімі падносамі, а ён сядзіць, як зачараваны. Перад лекцыямі мяне сустракаў, пасля лекцый чакаў... Я прыгожая была, але не толькі. Французы называюць гэта «шарман». Жанчына неабавязкова павінна быць прыгажуняй, значна горш, калі яна не «шарман»... Мы пажаніліся і яшчэ гады два насіліся са сваім каханнем. Потым супакоіліся і пачалі будаваць сям'ю. Ён шмат працаваў, часта ездзіў у камандзіроўкі. Я таксама працавала, а яшчэ паспявала даглядаць дом і нараджаць дзяцей. Паступова наша жыццё ўраўнаважылася, стала размераным, распланаваным. Мы «абраслі» агульнымі сябрамі і маёмасцю і неяк... перасталі звяртаць адно на аднаго ўвагу... Не, раніцай мы віталіся, снедалі, цікавіліся планамі на дзень, але хутчэй — па звычцы, на «аўтамаце». Я распаўнела, перастала насіць туфлі на высокіх абцасах і прыталеныя сукенкі... Ён з галавой акунуўся ў працу, дняваў і начаваў на сваіх аб'ектах, не вылазіў з камандзіровак... Я ніколі не надавала гэтаму асаблівага значэння — праца ёсць праца. Давярала яму цалкам. Пакуль аднойчы не сутыкнулася з ім твар у твар у гасцініцы, на першым паверсе якой арандавала пакой патрэбная мне кантора... Спачатку, памятаю, нават не зразумела, у чым справа — убачыла, узрадавалася... І толькі потым да мяне дайшло, што ён тры дні як знаходзіцца ў замежнай камандзіроўцы... Даруй, можа, я стаміла цябе? Табе непрыемна слухаць пра гэта?

Я размешвала ў кубку з чаем неіснуючы цукар і неадрыўна глядзела на яе.

— Што вы... Такое не часта пачуеш ад уласнай свекрыві... Па ўсіх законах жанру вы павінны былі накінуцца на яго і выдзерці вочы... Я, напрыклад, так і зрабіла б!

— Мне заўсёды падабалася тваё пачуццё гумару. Можа, і я зрабіла б менавіта так, але ён быў не адзін.

— З ёю?

— З кім жа яшчэ...

— Тым больш не бачу нагоды стрымліваць эмоцыі...

— Яна была… незямная… Худзенькая, памераў на шэсць худзейшая за мяне, з кароткай стрыжкай і вострым тварыкам. Яна так глядзела… Яна чакала скандалу, і я не захацела даваць ёй такое задавальненне.

— Ён пайшоў за вамі?

— Не, ён застаўся з ёю і прыехаў дадому пазней. Мне якраз хапіла часу, каб абдумаць сітуацыю і прыняць рашэнне. Безумоўна, я адвяла душу і прыпомніла яму ўсё. Але на большае ў мяне не хапіла смеласці. У мяне разрывалася сэрца, але я ведала, што... люблю свой размераны лад жыцця, свой дом, сваіх сяброў і суседзяў, свае звычкі. Аказалася, што ўсё гэта азначае для мяне нашмат больш, чым параненае самалюбства. У рэшце рэшт, столькі мужчын падманваюць сваіх жонак... Так я падумала тады... і засталася.

— Не бачу ў гэтым нічога дрэннага... Вы хацелі захаваць сям'ю. Ды і ўвогуле... Я ведаю вас сем гадоў і столькі ж назіраю за вамі. Вы не выглядаеце нешчаслівай. Ды і муж ваш таксама.

— Не выглядаць і не быць — гэта розныя рэчы, мая мілая. Пасля той гісторыі я канчаткова ператварылася для яго ў мэблю, у частку зручнага і прывычнага інтэр'ера, які заўсёды «пад рукой»... Ён ніколі не задаваў мне ніякіх пытанняў, акрамя тых, якія датычыліся выхавання дзяцей і пэўных фінансавых момантаў. Ён не цікавіўся ні маім меркаваннем, ні маімі ўспамінамі, ні маімі надзеямі. Ды і цяпер не цікавіцца.

— І вы думаеце...

— Я думаю, што атрымала тое, што заслужыла. Не трэба было кідацца наперарэз цягніку, які імчаў на поўнай хуткасці, і прымушаць яго тармазіць, мяняць курс... З цягам часу цягнік ператвараецца ў танк, які змінае ўсё на сваім шляху... У цябе ёсць што-небудзь выпіць?

— ???.. Вы мяне палохаеце...

— Спадзяюся, не больш, чым за ўсе гады нашага знаёмства...

— Здаецца, у халадзільніку стаяла бутэлька шампанскага... Але для яго патрэбна нагода. І пажадана — пазітыўная.

— Нагода? — перапытала мая свякроў і ўпершыню за вечар усміхнулася. — Ды іх колькі заўгодна! Ты стала свабоднай, перад табой адкрываюцца новыя перспектывы, ты можаш пачаць жыццё з чыстага ліста... Дастаткова?

І тут яна зрабіла тое, чаго раней не рабіла ніколі — абняла мяне і прытуліла да сябе.

— Неверагодна! Родная свякроў выступае супраць уз'яднання сям'і ўласнага сына, — сказала я, мякка вызваляючыся з яе абдымкаў і адчыняючы халадзільнік. — Каму расказаць — не паверыць!

Наталля УЛАДЗІМІРАВА

■ Кватэрнае пытанне

УЛАСНІК ПРАВА МАЕ...

Пры разводзе мы падзялілі дзяржаўную трохпакаёўку: я стаў жыць у адным пакоі, былая жонка з дзіцем — у двух. Потым яна прыватызавала іх і цяпер хоча прадаць. Ці ёсць у мяне, як наймальніка трэцяга пакоя, права пераважнай куплі?

У. БУДЗЬКО, *г. Мінск.*

Згодна з арт. 253 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь «суседзі» па кватэры (калі яны з'яўляюцца ўдзельнікамі долевай уласнасці на яе) такое права маюць. Гэта азначае, што прадавец долі абавязаны ў пісьмовай форме інфармаваць астатніх удзельнікаў долевай уласнасці аб намеры прадаць сваю долю пабочнай асобе з указаннем кошту і іншых умоў, на якіх яе прадае. Калі астатнія ўдзельнікі долевай уласнасці адмовяцца ад куплі або не набудуць долю, якая прадаецца, на працягу месяца, прадавец мае права прадаць сваю долю любой асобе.

У дадзеным выпадку кватэра не знаходзіцца ў агульнай (долевай) уласнасці былых сужэнцаў. Жонка, як уласнік двух прыватызаваных пакояў, мае права згодна з арт. 210 ГК ажыццяўляць у дачыненні да належнай ёй маёмасці любыя дзеянні, якія не супярэчаць заканадаўству, у тым ліку адчужаць (прадаваць, дарыць і інш.) сваю маёмасць. Муж, які пасля змянення дагавора найму жылога памяшкання (падзелу асабовага рахунку) займае адзін з пакояў, з'яўляецца наймальнікам і мае права толькі карыстацца жылым памяшканнем, якое займае, гэта значыць, пражываць, а таксама абмяняць або прыватызаваць у вызначаным парадку.

Агульная долевая ўласнасць на дадзеную кватэру магла ўзнікнуць у выпадку прыватызацыі былым мужам пакоя, які ён займае. Паколькі гэта не зроблена і былы муж не з'яўляецца ўласнікам кватэры, яго згода на адчужэнне двух пакояў былой жонкай не патрабуецца.

Такім чынам, можна зрабіць выснову, што калі частка трохпакаёвай кватэры (у гэтым выпадку два пакоі) прыватызаваная, а другая частка (адзін пакой) — не, і ў ім пражывае наймальнік на аснове дагавора найму жылога памяшкання, то пры адчужэнні (продажы) уласнікам сваіх двух пакояў пераважнае права куплі ў наймальніка аднаго пакоя не ўзнікае. Правам пераважнай куплі ў такім выпадку валодае мясцовы выканаўчы і распарадчы орган.

Віктар САВІЦКІ

ПЕРАВОД СТРЭЛАК АДАБ'ЕЦЦА НА РАСКЛАДЗЕ

У ноч з 24 на 25 сакавіка ў сумежных з Беларуссю дзяржавах стрэлкі гадзіннікаў пераводзяцца на адну гадзіну наперад.

У сувязі з гэтым аўтобусы дзяржаўнага прадпрыемства «Мінсктранс», якія выконваюць міжнародныя рэгулярныя рэйсы па шэрагу маршрутаў, зменяць час адпраўлення. У прыватнасці, аўтобус па маршруце Мінск — Варшава з Мінска ад АВ «Цэнтральны» пойдзе ў рэйс у 18.00 (замест 19.00) па серадах і нядзелях (з Варшавы ў 13.00 па чацвяргах і панядзелках). Аўтобусы па маршруце Мінск — Каўнас ад АВ «Цэнтральны» штодня будуць выпраўляцца ў 7.20 (замест 8.20), з Каўнаса — у 16.00; па маршруце Мінск — Калінінград ад таго ж аўтавакзала ў 6.00 (замест 7.00) па чацвяргах і суботах, з Калінінграда ў 12.30 замест 13.30 па пятніцах і нядзелях; па маршруце Мінск — Рыга праз Вільнюс ад АВ «Цэнтральны» ў 23.30 (замест 0.30), з Рыгі ў 23.50.

Па серадах, пятніцах і нядзелях аўтобусы па маршруце Мінск — Рыга ад АВ «Цэнтральны» аўтобусы пойдуць у 10.00 (замест 11.00), ад АВ «Маскоўскі» ў 10.30 (замест 11.30), з Рыгі адпаведна па чацвяргах, суботах і панядзелках у 8.00. Скарыстацца аўтобусам па маршруце Мінск — Рыга па серадах, пятніцах і нядзелях ад АВ «Усходні» можна будзе ў 21.00 (замест 22.00), ад АВ «Цэнтральны» ў 21.30 (замест 22.30), ад АВ «Маскоўскі» ў 22.00 (замест 23.00), з Рыгі адпаведна па чацвяргах, суботах і панядзелках у 21.20. Аўтобусы па маршруце Мінск — Талін праз Бягомль, Лепель, Полацк і Верхнядзвінск пойдуць у рэйс па пятніцах: ад АВ «Цэнтральны» ў 15.30 (замест 16.30), ад АВ «Маскоўскі» ў 16.00 (замест 17.00), з Таліна — па суботах у 16.00.

Пералічаныя маршруты будуць прыбываць у Мінск на адну гадзіну раней згодна з раскладамі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПАЖАР У КАЛЕКТЫЎНЫХ ГАРАЖАХ

Ён адбыўся раніцай у Смалявічах па вуліцы Забалотная.

— Пажарныя разлікі, якія прыбылі на месца першымі, убачылі, што адкрытым полымем гарыць дах і знутры — два памяшканні калектыўных гаражоў агульнай плошчай 6х40 метраў, — расказалі ў цэнтры прапаганды і навучання пры Мінскім абласным упраўленні МНС. — У выніку выгаралі тры гаражы, у адным з якіх быў знішчаны аўтамабіль «Фальксваген Гольф». Ніхто не пацярпеў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

І АБУЦЦА, І АПРАНУЦЦА

У Полацку супрацоўнікі ДАІ затрымалі аўтамашыну «Вольва» за рулём якой знаходзіўся жыхар гарадскога пасёлка Ветрына.

Ён перавозіў буйную партыю абутку без адпаведных дакументаў. Кантрабанду расійскай вытворчасці на агульную суму больш за 216,2 мільёна рублёў канфіскавалі. А ў вёсцы Урбаны Браслаўскага раёна супрацоўнікі міліцыі і памежнікі ў доме непрацуючай жанчыны знайшлі і канфіскавалі адзенне імпартнай вытворчасці, якое захоўвалася без адпаведных дакументаў. Адзенне ацанілі на суму 50 мільёнаў рублёў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

«ЛІПАВЫ» БАЛЬНІЧНЫ

Для студэнта аднаго з каледжаў Ваўкавыска спроба апраўдаць пропуск заняткаў без уважлівых прычын фіктыўнай даведкай аб непрацаздольнасці закончылася крымінальнай справай.

Пры дапамозе камп'ютарнай тэхнікі свайго сябра малады чалавек вырабіў «дакумент» адной з мясцовых бальніц і прад'явіў у вучэбную частку каледжа. «Нумар» не прайшоў, бо на лісце не было вуглавога штампа, і неўзабаве юнака з-за прагулаў пазбавілі стыпендыі. Падчас вобыску ў межах крымінальнай справы, якая не мае дачынення да гэтай гісторыі, у кватэры мясцовай жыхаркі выявілі некалькі сапсаваных даведак. Аказалася, што студэнт прасіў яе распісацца замест урача.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

LITESOUND ТРАПІЛІ Ў ПЯЦЁРАЧКУ

Беларускаму гурту дастаўся пяты «стартавы» нумар у другім паўфінале міжнароднага конкурсу песні «Еўрабачанне», што пройдзе сёлета ў Баку. Нашы ўдзельнікі выйдуць на сцэну 24 мая і паспрабуюць выканаць задачу мінімум — увайсці ў дзясятку лепшых з 18 удзельнікаў паўфіналу, каб прайсці ў фінал і спаборнічаць за перамогу.

Лёсаванне канкурсантаў адбылося на сустрэчы кіраўнікоў дэлегацый краін-удзельніц «Еўрабачання», дзе таксама была прадстаўлена новая (і канчатковая) версія песні «We Are The Heroes», якую гурт запісаў сумесна з грэчаскім прадзюсарам Дзімітрысам Кантопалусам. З гэтага моманту ў конкурсных песнях змяняць ужо нічога нельга, пад пагрозай адчувальных штрафных санкцый.

Нагадаем, у 57-м песенным еўраконкурсе бяруць удзел 42 краіны. У кожным з паўфіналаў — 22 і 24 мая — выступяць па 18 краін, а леташні пераможца, сёлетні гаспадар «Еўрабачання» Азербайджан і краіны-заснавальнікі конкурсу Францыя, Германія, Вялікабрытанія, Італія і Іспанія ўступяць у барацьбу адразу ў фінале.

У першым паўфінале выступаюць (у парадку, вызначаным лёсаваннем) Чарнагорыя, Ісландыя, Грэцыя, Латвія, Албанія, Румынія, Швейцарыя, Бельгія, Фінляндыя, Ізраіль, Сан-Марына, Кіпр, Данія, Расія, Венгрыя, Аўстрыя, Малдова і Ірландыя.

У другім паўфінале спаборнічаюць Сербія, Македонія, Нідэрланды, Мальта, Беларусь, Партугалія, Украіна, Балгарыя, Славенія, Харватыя, Швецыя, Грузія, Турцыя, Эстонія, Славакія, Нарвегія, Боснія і Герцагавіна, Літва. Такім чынам, як паказвае вопыт мінулых гадоў, беларусы могуць разлічваць на балы ад суседзяў — Украіны і Літвы, ад некаторых постсавецкіх краін — Грузіі і Эстоніі, а таксама ад Мальты, якая заўжды адзначае нашых удзельнікаў. Ці хопіць гэтага для таго, каб прайсці далей, — паглядзім...

— Ці вырашана канчаткова, колькі чалавек выйдуць на сцэну ад Беларусі? — датэлефанаваліся мы да кіраўніка праекта «Еўрафэст» Аляксандра Ціхановіча ў Баку. (У складзе «Litesound» пяцёра хлопцаў, а па правілах конкурсу на сцэне могуць знаходзіцца 6 удзельнікаў).

— Пакуль мы з гэтым пытаннем яшчэ не вызначыліся, будзем абмяркоўваць з рэжысёрам-пастаноўшчыкам. Спатрэбіцца 6 чалавек — будзе 6, хопіць 5 — хлопцы справяцца. Цяпер галоўныя нашы намаганні скіраваны на падрыхтоўку конкурснага нумара, здымкі кліпа і ўсяго астатняга, што неабходна для годнага прадстаўлення нашых канкурсантаў. Праца чакае напружаная: усё ж часу нямнога засталося — усяго 2 месяцы. Калі паступяць афіцыйныя запрашэнні выступіць дзесьці з прома-турам — з'ездзім. Але асноўнае, паўтаруся, — падрыхтавацца як след да выступлення.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Фота прэс-службы БТРК.